Известия Гомельского государственного университета
имени Ф. Скорины, №5(68), 2011

*УДК 94 (476) “185/191” : 316.34*

# Этнасацыяльныя асаблівасці грамадскай дыферэнцыяцыі ў Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX ст.

В. А. МІХЕДЗЬКА

В статье рассматривается проблема влияния этноконфессионального фактора на статусные отношения между основными сословными и социальными группами населения белорусских губерний во второй половине XIX – начале XX в.

**Ключевые слова:** Российская империя, Северо-Западный край, сословные отношения, национальная политика, иерархия, поляки, католики, евреи, русские, беларусы, статус.

The paper addresses the problem of the influence of ethno-confessional factor on the status relationship between the basic class and social groups of Belarusian provinces in the second half of the XIX – beginning of XX centuries.

**Keywords:** The Russian empire, The North-West region, estate relations, the national policy, the hierarchy, Poles, Catholics, Jews, Russian, Belarusians, the status.

Вывучэнне праблем і разнастайных фактараў грамадскага структуравання ў апошні перыяд існавання Расійскай імперыі з’яўляецца адным з найбольш цікавых і прыцягальных накірункаў развіцця сучаснай гістарычнай навукі. Тут відавочныя і значныя дасягненні, якія сталіся вынікам новых метадалагічных падыходаў да разгляду гэтай складанай праблематыкі. У вялікай ступені гэты прагрэс быў забяспечаны заходнімі навукоўцамі, якія найбольшую ўвагу надавалі разгляду нацыянальных аспектаў і рэгіянальных асаблівасцяў палітычнага развіцця Расійскай імперыі. Гэтыя даследаванні непасрэдна закранаюць грамадства Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX ст., калі яна з’яўлялася часткай так званага “Паўночна-Заходняга краю” Расійскай імперыі. Тут, безумоўна, неабходна асабліва адзначыць работы А. Капэлера [1; 2], С. Беккера [3], Д. Бавуа [4], Д. Слокума [5] і Т. Уікса [6].

У апошняе дзесяцігоддзе актывізаваліся і гісторыкі на постсавецкай прасторы. З’явіліся публікацыі Л. Гарызонтава [7], А. Міллера [8], М. Далбілава [9], Д. Сталюнаса [10], якія непасрэдна звяртаюцца да розных аспектаў урадавай палітыкі датычна польскай, літоўскай, украінскай і беларускай супольнасцяў на тэрыторыях “Заходняга краю”. Вынікам сталася больш узважанае разуменне характара расійскай дзяржаўнай палітыкі, у тым ліку русіфікацыйных мерапрыемстваў, і яе ўплываў на грамадскія працэсы ў гэтым рэгіёне. Трэба адзначыць, што і беларускія даследчыкі пасунуліся ў вывучэнні грамадскай эвалюцыі, што адбывалася ў Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX ст. [11–14]. У той жа час, шэраг аспектаў грамадскага ўзаемадзеяння, якое складвалася тут пад супярэчлівым уплывам разнастайных – эканамічных, дзяржаўна-палітычных, саслоўных, этнічных, рэлігійных – фактараў, яшчэ патрабуюць больш уважлівага разгляду. Сярод іх і тыя статусна-ерархічныя дачыненні, якія існавалі і змяняліся паміж асноўнымі этнаканфесійнымі супольнасцямі, а таксама ўнутры іх. Для лепшага разумення пазначанай праблематыкі варта прыгадаць сітуацыю, адлюстраваную Ф.Багушэвічам у ягоным вершы “Немец”, што пабачыў свет у 1891 г. Выдатна знаёмы з пачуццямі і светапоглядам беларускага селяніна, Багушэвіч апісаў разгубленасць і боязь “тутэйшага” мужыка-каталіка, які апынуўся ў вялікім горадзе : “*…А паноў як маку ды серад гароду, / Апроч таго, пропасць рознага народу! / Наш брат як увойдзе, – сам сябе баіцца : / Ці ісці без шапкі, ці дзе пакланіцца? / Ды надта ж і стыдна, каб не памыліцца: / Пакланіцца немцу ці якому жыду!*” [15, с. 108]. Тут трапна акрэслена сапраўды складанае становішча, у якім апыналіся сяляне пры сустрэчы з незнаёмымі, але апранутымі як “паны” людзьмі. У вясковай мясцовасці кожны такі чалавек мог стацца “начальствам”, непачцівасць да якога ажно да канца 1904 г. пагражала селяніну колькідзённым арыштам і цялесным пакараннем. Але ж у горадзе распазнаць яго сярод процьмы іншых падобных было цяжка і ці бяспечней было б

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

увогуле “ісці без шапкі”? Такім чынам, з паказанага прыкладу паўстае пытанне: каму і чаму мусіў кланяцца беларускі селянін на мяжы XIX–XX ст.? Калі шырэй – як будаваліся статусныя, ерархічныя адносіны асноўных сацыяльных і канфесійных супольнасцей у беларускім краі на тыя часы?

Безумоўна, адным з найбольш значных фактараў, які вызначаў грамадскую дыферэнцыяцыю ў Беларусі на працягу другой паловы XIX – пачатку XX ст., заставаўся саслоўны, станавы падзел. Саслоўная ерархія, асвечаная традыцыяй і замацаваная законам, забяспечвала сацыяльныя і эканамічныя прэферэнцыі “первенствующему сословию” – дваранству. Даследчыкамі ўжо адзначалася моц саслоўнай традыцыі, якая захоўвалася на пачатку XX ст. і будавалася на светапоглядзе традыцыйных груп, перад усім дваранства і яшчэ больш – якраз сялянства [16, с. 153, 162]. Намаганні захаваць гэтую традыцыю выяўлялі ў часы свайго царавання Аляксандр III і Мікалай II. Але і самі “традыцыйныя” саслоўныя схемы сацыяльнага ўзаемадзеяння тут адрозніваліся. Часткай яны былі сфармаваны яшчэ ў часы Рэчы Паспалітай, часткай былі навязаныя ўжо падрасійскай рэчаіснасцю. Прапанаваныя мясцовай традыцыяй узоры сацыяльнай ідэнтыфікацыі істотна адрозніваліся ад замацаваных у расійскім заканадаўстве нормаў. Трэба да таго ўлічваць і наяўнасць адасобленых этнаканфесійных супольнасцей – яўрэйскай, мусульманскай, стараveраў, а таксама і каталіцкай грамады, становішча якіх рэгулявалася як мясцовай сацыяльнай і культурнай традыцыяй, гэтак асобна цэлым комплексам расійскага канфесійнага заканадаўства.

На працягу XIX ст., і асабліва яго другой паловы, ў Паўночна-Заходнім краі ажыццяўляліся ўрадавыя мерапрыемствы “абмежавальнага заканадаўства”. У пераважнай ступені яны былі накіраваны супраць мясцовых палякаў і яўрэяў і мелі на мэце стварыць найбольш спрыяльныя ўмовы для “расійскага” элемента ў краі. Такім чынам, тут перапляталіся не толькі ерархіі, што былі народжаны сацыяльнай традыцыяй і працэсам мадэрнізацыі сацыяльнага і гаспадарчага жыцця, але таксама і народжаныя ўрадавымі мерапрыемствамі.

Беларускія рэаліі другой паловы XIX – пачатку XX ст. дэманструюць уражлівае несупадзенне ўрадавых падыходаў нават у межах традыцыйнай саслоўнай ерархіі. З аднаго боку, расійскае кіраўніцтва на працягу парэформеннага часу клапацілася пра падтрымку дваранскага саслоўя. З другога – ажыццяўленне ў краі абмяжавальнай пазямельнай і фінансавай палітыкі мусіла скараціць эканамічную вагу польскага землеўладальніцкага дваранства. Гэта, зразумела, не магло не адбіцца на сацыяльным аўтарытэце шляхты перад усім сярод праваслаўнага беларускага сялянства.

“Абмежавальныя” мерапрыемствы мясцовым польскім дваранствам разглядаліся не толькі і нават не столькі з пункту гледжання нацыянальнага. Гэтыя дзеянні успрымаліся як замах на пракаветныя падмуркі саслоўна-станавага парадку і на асвечаныя законам і традыцыяй адносіны уласнасці. Буйны землеўласнік Э. Вайніловіч са скрухай заўважаў: “Справа сялянская … перайшла да кампетэнцыі … людзей, запрошаных з глыбіні Расіі, з мясцовымі варункамі незнаёмых, патыхаючых пераважна нянавісцю да ўсяго, што польскае, што дыхала культурай і даўняй традыцыяй грамадскага парадку” [17, s. 13]. Сярод іх “знаходзіліся і людзі ідэйныя, але ж яны і былі найбольш шкодныя, бо намагаліся прышчапіць сярод насельніцтва заразу нігілізму і сацыялізму, прынесеную з Усходу” [17, s. 38]. З гэтага пункту, гледжання дзеянні адміністрацыі стваралі небяспечны прэцэндэнт, які паказваў дарогу сялянскім патрабаванням памешчыцкай зямлі. Успрыняцце драпежных набыўцоў, дзеячаў мураўёўскай адміністрацыі, як “чырвоных”, а яе мерапрыемстваў – як разбуральнай для ўсяго маёмаснага ладу імперыі, як сацыялістычнай “аграрнай дэмагогіі” аб’ядноўвала польскіх землеўладальнікаў Заходняга краю і расійскую зямельную арыстакратыю ў справе абароны сваіх інтарэсаў перад патрабаваннямі немаёмасных слаёў насельніцтва [18, с. 88, 110]. У той жа час, дыскрымінацыйныя пазямельныя законы прымушалі польскіх памешчыкаў па ўсяму Заходняму краю мацней трымацца за бацькоўскую спадчыну [4, с. 25; 19, с. 117]. “Але – Бог усемагутны – тое, што на згубу нашых землеўладальнікаў было разлічана, пайшло ім на карысць…” – адзначаў у сваіх успамінах Э. Вайніловіч [17, s. 13]. Гадаваўся новы тып землеўладальніка-прадпрыймальніка: “шляхта наша, ад усякага ўдзелу ў жыцці грамадскім і кіраўнічым пасля падзеяў 1863 г. адсунутая, мусіла самнехаць звярнуцца да раллі альбо шукаць хлеба ў самас-

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

тойных прадпрыемствах і …выказала ў гэтым накірунку шмат жыццёвых сіл. Паволі…маёнткі пачалі ад запазычаннасці вызваляцца і зямяне пачалі ўваходзіць у дабрабыт. Нават указ 10 снежня 1865 г. … умацоўваў тых, хто на зямлі сядзеў, бо кожны разумеў, што хто той зямлі пазбавіцца, то ўжо да яе не вернецца. Пазбаўленне зямлі…уважалася за грэх антынацыянальны…" [17, s. 38–39]. Ад 1880-х гадоў руплівае гаспадаранне і ўдалыя аперацыі з каштоўнымі паперамі ўжо ўважаліся мясцовым польскім землеўладальніцкім станам за патрыятычны абавязак [20, s. 7]. У выніку, у канцы XIX і з пачаткам XX в. "капіталізаваны польскі маёнтак на Беларусі зрабіўся прыкладам тэхнічнай высока-пастаўленай гаспадаркі, ператварыўся ў аграрнага культуртрэгера ў тэхнічна-адсталай і беднай капіталамі сялянскай Беларусі" [18, с. 268]. Падобную з'яву адзначыў Д. Бавуа і ў украінскіх тэрыторыях Заходняга краю" [4, с. 155]. Для буйной землеўладальніцкай польскай шляхты абмяжавальны рэжым у зямельнай сферы ствараў значныя перашкоды і нязручнасці, але не стаўся фатальным і нават садзейнічаў капіталістычнай перабудове памешчыцкай гаспадаркі. Дзякуючы сувязям у вышэйшым прыдворным асяроддзі і хабарніцтву расійскіх чыноўнікаў многія абмежаванні і забароны магчыма было абыйсці [21, с. 52–53].

Зразумела, што гэтая практыка толькі падмацоўвала аўтарытэт мясцовага заможнага "зямянства" ў вачах сацыяльных нізоў. Як заўважыў Г. Фрыз, як "на ўзроўні закона, так і ў масавай свядомасці, саслоўная структура заставалася дзіўна жывучай, забяспечвала асноўныя спосабы калектыўнай ідэнтыфікацыі і стварала аснову сацыяльнай стратыфікацыі ў апошні перыяд існавання імператарскай Расіі…. спадчыннасць статусу і моцна выяўленая тэндэнцыя да ўнутрыстанавай эндагаміі грунтаваліся не толькі на пастановах закона, але таксама на адносінах уласнасці, на звычаі і меркаваннях прэстыжу" [16, с. 146]. Як раз гэтыя акалічнасці сталіся сюжэтнай асновай для "Паўлінкі" Янкі Купалы, які сам паходзіў з дробнай "засцянковай" шляхты. Бацька галоўнай гераіні – засцянковы шляхціц – зненавідзеў абранніка сваёй дачкі, бо той быў "з мужыкоў" [22, с. 33]. Сімпатыі бацькі былі на баку іншага прэтэндэнта, прыналежнасць якога да шляхецкага стану выяўлялася ў камічнай "пальшчызне".

Такім чынам, структура грамадскай ерархіі, якая сфармавалася яшчэ ў часы Рэчы Паспалітай і на версе якой стаяла землеўладальніцкая шляхта, працягвала існаваць і канцы XIX – пачатку XX ст. Разам з тым мацнелі ерархічныя дачыненні, якія былі заснаваны ўжо не на аўтарытэце і магчымасцях, якія давала прыналежнасць да дваранскага стана, але на маёмасных адрозненнях, незалежна ад саслоўя. Прыналежнасць да шляхецкага стану ўсё яшчэ забяспечвала аўтарытэт, эканамічныя і сацыяльныя прэферэнцыі, але насамрэч пераважна для найбольш заможнай і радавітай яе часткі. Для немаёмасных і дробнамаёмасных уласнікаў прыналежнасць да шляхецтва ў другой палове XIX ст. ужо стварала асабліва відавочныя цяжкасці і нараджала пратэстныя настроі. З гэтай прычыны сацыяльны статус дробнай шляхты зніжаўся і захоўваўся пераважна з моцы культурнай традыцыі, пераважна ў асяроддзі каталіцкага насельніцтва. Аднак з вясны 1905 г. абмежаванні для "асобаў польскага паходжання" ў сферы землеўладання былі ў значнай ступені скасаваны. У выніку эканамічная, а разам з гэтым сацыяльная вага польскіх землеўладальнікаў яшчэ больш ўзрасла, а дробная шляхта ўмацавала свой вышэйшы статус у дачыненні да беларускага сялянства.

Адначасова польскія землеўладальнікі, якія належалі да каталіцтва, разам з астатнімі каталіцкімі вернікамі цярпелі істотныя абмежаванні рэлігійнага жыцця, якія на фоне пануючага праваслаўя набывалі выразна дыскрымінацыйнае і нават зняважлівае аблічча. Гэтыя забароны тычыліся такіх важнейшых для функцыянавання касцёла сфераў, як непасрэднай сувязі з Рымам, як рамонт старых і пабудова новых касцёлаў, публічных праяваў рэлігійнага жыцця католікаў, дзейнасці каталіцкіх святароў, у тым ліку і вышэйшых ерархаў. Значная частка каталіцкіх касцёлаў передаваліся праваслаўнай царкве. Далучалася да гэтых захадаў і забарона польскай адукацыі, якая фактычна мусіла існаваць ва ўмовах падполля [23, с. 86, 91]. Гэта стварала ўражлівы кантраст з сацыяльным і эканамічным дамінаваннем польскіх землеўладальнікаў, асабліва што да праваслаўнага сялянства, ставіла іх у магчымасцях ажыццяўлення сваіх рэлігійных патрэбаў на ніжэйшую прыступку нават у параўнанні з яўрэйскім насельніцтвам, чые рэлігійнае жыццё не ведала такіх уражлівых абмежаванняў. Выданне ў красавіку 1905 г. т.зв. "указа аб верацярпімасці", безумоўна, садзейнічала падвышэнню гра-

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

мадскага аўтарытэту каталіцкай царквы і яе вернікаў. Сведчаннем гэтага стаўся і пераход пасля 1905 г. у каталіцтва значнай колькасці праваслаўных, збольшага былых уніятаў [24, с. 86–87]. Уплывовымі апекунамі і абаронцамі каталіцкай царквы ў краі і да "ўказа аб верацярпімасці" і пасля яго выдання якраз выступала буйная землеўладальніцкая шляхта, якая выкарыстоўвала ў гэтых мэтах свае саслоўныя сувязі ў асяроддзі вышэйшай пецярбургскай бюракратыі [25, с. 128–129].

Яшчэ адна буйная этнаканфесійная група – шматлікае яўрэйскае насельніцтва беларускіх губерняў – таксама існавала ў рэжыме абмежавальнага заканадаўства. Расійскае заканадаўства трактавала яўрэяў як "іншародцаў" і пакідала за ім адносна значныя ў параўнанні з ішым неправаслаўным насельніцтвам края магчымасці рэлігійнага жыцця. Затое ў сферы сацыяльнай і эканамічнай яўрэі цярпелі значную дыскрымінацыю, асабліва выразную ў параўнанні з праваслаўным, а ў шэрагу выпадкаў – нават і з каталіцкім насельніцтвам. У 80-х – 90-х гадах XIX ст. яўрэям было забаронена рассяленне па-за гарадамі і мястэчкамі, што прывяло да значнай перанаселенасці, былі істотна абмежаваны магчымасці эканамічнай, прафесійнай, грамадскай дзейнасці, удзел у ўстановах гарадскога самакіравання, атрымання адукацыі. У выніку яўрэйскае насельніцтва края было сканцэнтравана ў сферы гандлёва-рамеснай дзейнасці. Напачатку XX ст. яўрэі складалі каля 60% сярод працоўных, занятых у прамысловасці, гандлю, сферы паслуг [26]. Якраз тут у значнай ступені праяўляліся працэсы фармавання новай сацыяльнай стратыфікацыі, дзе ўсё большую вагу набывалі фактары эканамічнага і прафесійнага стутусаў. Эканамічныя сувязі злучалі яўрэйскую гандлёва-прадпрыймальніцкую групоўку з мясцовыміі землеўладальнікамі, што падвышала сацыяльны статус заможнай часткі яўрэйскай грамады. Разам з гэтым мянялася і агульнае ўспрыняцце яўрэйскага насельніцтва з боку сацыяльных нізоў хрысціянскай супольнасці. У хрысціянскім мяшчанскім асяроддзі яны традыцыйна разглядаліся як няздольныя да абароны сваёй годнасці, як аб'ект цкавання і пагарды [27, с. 75, 190]. Але хуткае пашырэнне арганізаванага яўрэйскага рабочага руху, яго актыўнае супрацьстаянне ўладам у першыя гады XX ст. і асабліва падзеі лета – восені 1905 г. садзейнічалі падвышэнню грамадскага аўтарытэту яўрэйскай грамады.

Расійскае панаванне ў краі адбудоўвала тут і ўласцівыя яму ерархічныя сацыяльныя структуры. Яны былі прадстаўлены як уласна ўладнай ваенна-паліцэйскай і адміністратыўнай структурамі, гэтак і расійскім землеўладаннем. Адпачатку ўлада імкнулася пашырыць тут рускае землеўладальніцкае дваранства, а таксама пашырыць прысутнасць выхадцаў з унутраных губерняў у складзе мясцовага чыновенства. Аднак пры значным росце колькасці расійскіх землеўладальнікаў на працягу другой паловы XIX – пачатку XX ст. іх вага ў грамадскім і культурным жыцці саступала ўплывам польскім. Яшчэ А. Цвікевічам было адзначана эканамічная і культурная няпэўнасць расійскага землеўладальніцкага стана ў краі, яго залежнасць ад дзяржаўнай апекі [18, с. 304]. Мясцовае чынавенства ў пачатку XX ст. амаль напалову складалася з выхадцаў з унутраных губерняў імперыі [28, с. 333]. Прывелеяванае становішча гэтай групоўкі ў мясцовым грамадстве было забяспечана імперскай уладай. Гэтыя прывілеі, дарэчы, не абавязкова былі матэрыяльнага кшталту. Да 1905 г. задавальненне прыносіла самое ўсведамленне сваёй прыналежнасці да ўлады, да людзей "вышэйшага гатунку", асабліва ў параўнанні з "іншародцамі", адчуць сябе "англічанінам у Індыі". Напрыклад, магчымасць беспакарана штурхнуць і абразіць яўрэя "Жыд, чаго дарогу не саступаеш?". Па сведчанні сучасніка, вельмі значная частка мясцовага расійскага чынавенства лічыла "яўрэяў і палякаў ворагамі, ...сябе арыстакратамі – белай скурай, а яўрэяў – чорнай" [27, с. 903]. У той жа час, магчымасці культурнай канкурэнцыі з мясцовай польскай грамадой былі ў чыноўніцкім асяроддзі недастатковыя і трымаліся выключна на абмежавальных мерапрыемствах урада [29, с. 122].

Другой часткай "рускай народнасці" беларуска-літоўскага краю былі рускія стараверы. Віленскі генерал-губернатар П.Дз. Святаполк-Мірскі падкрэсліваў значнасць місіі старавераў па ўмацаванні ў краі "рускіх культурных пачаткаў". Менавіта рускія стараверы, якія захавалі "ў поўнай чысціні рускую мову і рускія звычаі" і ў супрацьвагу беларусам "зусім не паддаліся ўплывам польскай народнасці і каталіцкай царквы", названы віленскім генерал-губернатарам сапраўдным апірышчам расійскага ўраду ў краі [30, л. 42 об. – 43]. Аднак у спра-

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

ве набыцця зямельнай уласнасці стараверы былі таксама абмежаваны, як і каталіцкая, і яўрэйская грамада, хаця і ў меншай ступені. Магчымасці старавераў набываць зямлю ў беларускіх губернях абмяжоўваліся і прадстаўнікамі ўлады, і прадстаўнікамі афіцыйнай праваслаўнай царквы [31, с. 178]. На фоне паўсюдзённых публічных праяваў рэлігійнага жыцця іншых плыняў хрысціянства і іудаізма – які ў мястэчках і гарадах быў асабліва заўважны штотыдзень – стараверам забаранялася сведчыць сваё веравызнанне. Яны да красавіка 1905 г. працягвалі разглядацца заканадаўствам, мясцовай адміністрацыяй, і асабліва – праваслаўнай ерархіяй – як асяроддзе, шкоднае для дзяржавы і ўлады і нават злачыннае. Ва ўмовах канкурэнцыі з яўрэйскім гандлёва-рамесным насельніцтвам такія абмежаванні ўспрымаліся асабліва хваравіта, што спрыяла распаўсюджанню ваяўнічых антысеміцкіх настрояў. У пэўнай ступені стараверы гэтым "кампенсавалі" ўласная крыўды [27, с. 190].

Нарэшце, большасць насельніцтва краю складалі беларусы. У канцы XIX ст. абсалютная большасць беларусаў – да 94% – была занята ў сельскай гаспадарцы. Трэба пагадзіцца з Т. Уіксам у тым, што на пачатку XX ст. расійская адміністрацыя (за невялікімі выключэннямі кшталту П.Дз. Святаполка-Мірскага) не заўважала "беларускага пытання" [6, с. 591]. Фармальна праваслаўная частка беларусаў лічылася "рускімі", што, на думку А. Капэлера, адкрывала для іх магчымасці кар'ернага росту пры ўмове валодання рускай мовай [2]. Аднак пераважная іх частка належала да сялянскага саслоўя з апаведнымі сацыяльнымі і прававымі абмежаваннямі. З пачаткам XX ст. магчымасці сацыяльнага росту для мясцовага праваслаўнага сялянства і мяшчанства сапраўды павялічыліся. Прадстаўнікоў гэтых саслоўных груп усё болей сярод мясцовай адміністрацыі і паліцыі, службоўцаў прыватных устаноў і чыгункі. Яны, як ужо было заўважана А. Цвікевічам, стварылі сацыяльную аснову для пашырэння "западно-русской" грамадска-палітычнай плыні. "Западно-руссы" разлічвалі з дапамогай ураду забяспечыць сябе паважнае месца ў сацыяльнай ерархіі края, але гэтыя намеры засталіся няспраўджаныя [18, с. 300, 306]. На справе скарыстаць з фармальнай прыналежнасці да "рускай народнасці" для прадстаўнікоў беларускага сялянства было вельмі цяжка дзеля захавання сацыяльных перапонаў і канкурэнцыі з боку больш надзейных, у вачах адміністрацыі, ураджэнцаў унутраных расійскіх губерняў. Беларусы ж каталіцкага веравызнання і на пачатку XX ст. цярпелі дыскрымінацыю як у сацыяльна-эканамічнай, гэтак і ў веравызнаўчай сферы. У рэчаіснасці, такім чынам, магчымасці кар'ернага росту былі абумоўлены паспяховасцю пазбаўлення ад спецыфічных рысаў беларускай моўна-культурнай ідэнтычнасці. Пры адсутнасці развітай і шырокай рускамоўнай адукацыйнай і інфармацыйнай прасторы для большасці беларусаў з сялянскіх нізоў цалкам пазбавіцца спецыфічных адзнакаў "сялянскай" ідэнтычнасці было вельмі цяжка, што садзейнічала захаванню нізкага сацыяльнага статуса.

Такім чынам, пастаўленае на пачатку пытанне не мае адназначнага адказу. На мяжы XIX–XX ст. у Беларусі існавала складаная і супярэчлівая сістэма саслоўных і этнаканфесійных абмежаванняў і дазваленняў. Кожная з асноўных саслоўных груповак была падзелена па этнаканфесійнаму прызнаку, што нараджала ў межах групы значную статусную дыферэнцыяцыю. У кожным выпадку існавала ўнікальнае спалучэнне фармальных і сапраўдных перавагаў і абмежаванняў, якія, відавочна, не дазвалялі аніводнай саслоўнай і этнаканфесійнай групоўцы ў складзе мясцовага грамадства заняць выключнае пераважнае месца. Верхнія прыступкі грамадскай ерархіі на мяжы XIX–XX ст. працягвалі займаць буйныя польскія землеўладальнікі, якія здолелі захаваць і эканамічны, і культурны ўплыў, а разам з гэтым і сацыяльнае дамінаванне. На ніжняй прыступцы знаходзілася беларускае сялянства. Адпаведна павялічвалася роля індывідуальнага статуса кожнай асобы ў залежнасці ад сукупнасці сацыяльных, маёмасных і прафесійных фактараў.

**Літаратура**

1 Каппелер, А. Россия – многонациональная империя / А. Каппелер. – М.: Традиция – Прогресс-Традиция, 2000. – 344 с.

2 Каппелер, А. Мазепинцы, малороссы, хохлы: украинцы в этнической иерархии Российской империи / А. Каппелер // Россия – Украина: история взаимоотношений. – М.: Школа «Языки русской культуры», 1997. – С. 125–144.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

3 Беккер, С. Миф о русском дворянстве. Дворянство и привилегии последнего периода имперской России / С. Беккер. – М.: Новое литературное обозрение, 2004. – 344 с.

4 Бовуа, Д. Битва за землю в Україні. 1863–1914. Поляки в соціо-етнічних конфліктах / Д. Бовуа. – Київ: Критика, 1998. – 410 с.

5 Слокум, Дж. Кто и когда были «инородцами»? Эволюция категории «чужие» в Российской империи / Дж. Слокум // Российская империя в зарубежной историографии. Работы последних лет: Антология. – М.: Новое издательство, 2005. – С. 502–531.

6 Викс, Т. «Мы» или «они»? Белорусы и официальная Россия, 1863–1914 / Т. Викс // Российская империя в зарубежной историографии. Работы последних лет: Антология. – М.: Новое издательство, 2005. – С. 589–609.

7 Горизонтов, Л.Б. Парадоксы имперской политики: Поляки в России и русские в Польше (XIX – начало XX в.) / Л.Б. Горизонтов. – М.: Индрик, 1999. – 272 с.

8 Миллер, А.И. Империя Романовых и национализм: Эссе по методологии исторического исследования / А.И. Миллер. – М.: Новое литературное обозрение, 2006. – 248 с.

9 Долбилов, М.Д. Русский край, чужая вера: Этноконфессиональная политика империи в Литве и Белоруссии при Александре II / М.Д. Долбилов. – М.: Новое литературное обозрение, 2010. – 1000 с.

10 Сталюнас, Д. Границы в пограничье: белорусы и этнолингвистическая политика Российской империи на западных окраинах в период Великих реформ / Д. Сталюнас // Ab Imperio. – 2003. – № 1. – С. 261–292.

11 Шыбека, З.В. Гарады Беларусі (60-я гады XIX – пачатак XX стагоддзяў). – Мінск: ЭўроФорум, 1997. – 320 с.

12 Терешкович, П.В. Этническая история Беларуси XIX – начала XX в.: В контексте Центрально-Восточной Европы / П.В. Терешкович. – Мінск: БГУ, 2004. – 223 с.

13 Смалянчук, А.Ф. Паміж краёвасцю і нацыянальнай ідэяй. Польскі рух на беларускіх і літоўскіх землях. 1864–1917 гг. / А.Ф. Смалянчук. – Гродна: ГрДУ, 2001. – 322 с.

14 Яноўская, В.В. Хрысціянская царква ў Беларусі ў 1863–1914 гг. / В.В. Яноўская. – Мінск, 2002.

15 Багушэвіч, Ф. Немец / Францішак Багушэвіч // Творы. – Мінск: Маст. літ., 2009. – 150 с.

16 Фриз, Г.Л. Сословная парадигма и социальная история России / Грегори Л. Фриз // Американская русистика: вехи историографии последних лет. Императорский период: Антология / Сост. М. Дэвид-Фокс. – Самара: Изд-во "Самарский университет", 2000. – С. 121–163.

17 Woyniłłowicz, E. Wspomnienia 1847–1928 / E. Woyniłłowicz. – Wilno, 1931. – 368 s.

18 Цвікевіч, А. "Западно-руссизм": Нарысы з гісторыі грамадскай мыслі на Беларусі ў XIX і пачатку XX вв. / А. Цвікевіч. – Мінск: Навука і тэхніка, 1993. – 352 с.

19 Панюціч, В. Нацыянальны аспект пазямельнай палітыкі царызму на Беларусі эпохі капіталізму (1861–1917 гг.) / В. Панюціч // Białoruskie Zeszyty Historyczne. – № 11. – С. 107–125.

20 Korwin-Milewski, H. Siedemdziesąt lat wspomnień (1855–1925) / H. Korwin-Milewski. – Poznań, 1930. – 603 s.

21 Панюціч, В. Нацыянальны аспект пазямельнай палітыкі царызму на Беларусі эпохі капіталізму (1861–1917 гг.) / В. Панюціч // Białoruskie Zeszyty Historyczne. – № 10. – С. 41–55.

22 Купала, Я. Паўлінка: камедыя ў 2-х актах / Янка Купала. – Мінск: Маст. літ., 2006. – 63 с.

23 Грыгор'ева, В. Русіфікацыя насельніцтва і канфесіянальная палітыка царызму на Беларусі (1861–1904) / В. Грыгор'ева // Канфесіі на Беларусі (к. XVIII–XX ст.). – Мінск: ВП "Экаперспектыва", 1998. – С. 58–110.

24 Яноўская, В.В. Указ 17 красавіка 1905 г. – Аб замацаванні пачаткаў верацярпімасці ў сучаснай гістарычнай традыцыі / В.В. Яноўская // Працы гістарычнага факультэта БДУ: навук. зб. Вып. 2 / рэдкал. У.К. Коршук (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск: БДУ, 2007. – С. 85–91.

25 Ліст княгіні Марыі Магдаліны Радзівіл да міністра ўнутраных справаў Расійскай імперыі. 1913 г. / Яноўская В. / Узаемаадносіны "царква – дзяржава" ў Расійскай імперыі на пачатку 20 ст. // Гістарычны Альманах. – 2002. – Т. 6. – С.117–129.

26 Біч, М.В. Нацыянальны склад прамысловага пралетарыяту Беларусі у канцы XIX – пачатку XX ст. / М.В. Біч // Весці Акадэміі навук Беларускай ССР. Сер. грамадскіх навук. – 1972. – № 4. – С. 34–40.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

27 Гомельский процесс. Подробный отчет / Сост. Б.А. Кревер. – Спб.: Тип. “Общественная польза”, 1907. – 1204 с.

28 Нарысы гісторыі Беларусі: у 2 ч. / АН Беларусі. Ін-т гісторыі. – Мінск: Беларусь, 1994. – Ч. 1. – 527 с.

29 Крыжановский, С.Е. Заметки русского консерватора / С.Е. Крыжановский // Вопросы истории. – 1997. – № 4. – С. 107–126.

30 Отчет виленского генерал-губернатора П.Д. Святополка-Мирского от 20 мая 1904 года // Российский государственный исторический архив. – Ф. 1284. – Оп. 194. – Д. 136.

31 Горбацкий, А.А. Белорусское имение Ветка и его судьба в начале XX в. / А. Горбацкий // Старообрядчество: история, культура, современность. Материалы. – М., 2002. – С. 174–179.

Гомельский государственный
университет им. Ф. Скорины

Поступило 11.01.10

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ